кларнет; гл. *Музычных інструментаў вытворчасць*). Спрадвеку нар. М.і. звязаны з традыц. каляндарна-земляробчымі і сямейнымі абрадамі, пастухоўскім, паляўнічым і ваен. побытам, рознымі святамі. У вясковай практыцы М.і. выкарыстоўваюць як сольныя і ансамблевыя (гл. *Народныя інструментальныя ансамблі*). Амаль усе прафес. М.і. паявіліся ў выніку ўдасканалення народных. Да прафесійных адносяцца інструменты сімф. (опернага), духавога і эстр. аркестраў, а таксама электра- і мех. інструменты, сінтэзатары, камп'ютэры і інш. Гл. таксама *Аркестр, Інструментоўка, Партытура.*

Літ.: Закс К. Современные оркестровые музыкальные инструменты: Пер. с нем. М., 1932; Чулаки М.И. Инструменты симфонического оркестра. 4 изд. М., 1983; Вертков К., Благодатов Г., Язовицкая Э. Атлас музыкальных инструментов народов СССР. 2 изд. М., 1975; Назіна І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты. Мн., 1997; Sachs K. The History of musical instruments. New York, 1940.

І.Дз.Назіна.

МУЗЫ́ЧНЫЯ ТАВАРЫ́СТВЫ, аб'яднанні прафес. музыкантаў і аматараў музыкі, якія маюць на мэце пашырэнне муз. культуры, прапаганду і вывучэнне муз. мастацтва ці асобных яго відаў. Падзяляюцца на выканальніцкія (хар., аркестравыя, камерныя), навук., асветныя, творчыя. Існуюць т-вы нац. і міжнародныя (Міжнар. т-ва сучаснай музыкі, *Міжнароднае таварыства музыказнаўства*, Міжнар. т-ва муз. выхавання, Міжнар. савет нар. музыкі; многія з іх уваходзяць у *Міжнародны музычны савет* пры ЮНЕСКА).

Першыя М.т. — муз. акадэміі — узніклі ў Італіі ў 16 ст. У 17 ст. падобныя т-вы («калегіум музікум») з'явіліся ў інш. еўрап. краінах. У 18 ст. ўзніклі канцэртныя, т. зв. філарманічныя М.т. У 19 ст. пашырыліся аматарскія хар. т-вы, т-вы па прапагандзе музыкі і выданні твораў асобных кампазітараў (Бахаўскае, Гендэлеўскае, Вагнераўскае і інш.). У Расіі першае М.т. ўзнікла ў Пецярбургу («Музычны клуб», 1772). Існавалі таксама Пецярбургскае філарманічнае т-ва (1802), Рус. муз. т-ва (1859—1917), *Музычна-этнаграфічная камісія*, Рус. харавое т-ва (Масква, 1878), Маскоўскае філарманічнае т-ва (1883). У 1923 створаны Асацыяцыя сучаснай музыкі і Рас. асацыяцыя пралетарскіх музыкантаў (РАПМ), на аснове якой у 1932 заснаваны *Саюз кампазітараў Расіі*. З інш. М.т. — Аб'яднанне рэв. кампазітараў і муз. дзеячаў (1925—32), Усеўкраінскае муз. т-ва імя Леантовіча (1921—28), Усеўкраінскае т-ва рэв. музыкантаў (1928—32), Усерас. хар. т-ва (з 1957).

На Беларусі аб'яднанні прафес. музыкантаў і аматараў пашырыліся ў канцы 19—пач. 20 ст. Існавалі: *Мінскае музычна-літаратурнае таварыства*, Мінскае муз. т-ва (1880), Віцебскае т-ва аматараў муз. і драм. мастацтва (1883), Брэсцкае муз.-драм. т-ва аматараў (1885), Магілёўскае муз.-драм. т-ва (1886), Мінскае муз.-драм. т-ва (1893), Мінскі муз. гурток (1896), *Мінскае таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, Магілёўскі літаратурна-музычна-драматычны гурток, Мінскае літаратурна-артыстычнае таварыства, Віцебскі музычна-драматычны гурток*, Слуцкае літ.-артыстычнае т-ва (1906), *Беларускі музычна-драматычны гурток* у Вільні, *Мінскае таварыства сяброў музыкі*, Т-ва імя А.Рубінштэйна ў Віцебску (1920-я г.), «Музыку — масам» у Мінску (з 1929). Бел. кампазітары ўваходзілі ў Т-ва драм. пісьменнікаў і кампазітараў (з 1926), пазней стварылі кампазітарскую секцыю пры Бел. асацыяцыі пралет. пісьменнікаў і паэтаў (1928—32). *Саюз кампазітараў Беларусі* напачатку існаваў як аўтаномная секцыя Саюза пісьменнікаў Беларусі, з 1938 самастойны. У 1987 створаны *Саюз музычных дзеячаў Беларусі* (да 1991 муз. т-ва Беларусі).

А.Л.Капілаў.

МУЗЫ́ЧНЫЯ ШКО́ЛЫ, навучальныя муз. ўстановы; пачатковая ступень у сістэме *музычнай адукацыі*. Маюць на мэце даць навучэнцам агульную муз. адукацыю, выявіць найб. здольных дзяцей, якія жадалі б атрымаць спец. муз. адукацыю. У М.ш. вывучаюцца: ігра на інструменце (фп., струнныя, смычковыя, духавыя і ўдарныя, народныя), сальфеджыо, муз. грамата і тэорыя, муз. л-ра, хар. спевы, ансамблі і аркестры. Тэрмін навучання 5 і 7 гадоў. На Беларусі першапачаткова музыцы навучалі ў школах пры цэрквах і манастырах. У 16—17 ст. цэнтрамі хар. муз. адукацыі былі *брацкія школы*. У 18 ст. існавалі М.ш. пры шматлікіх прыватнаўласніцкіх капэлах, аркестрах і харах, дзе рыхтавалі музыкантаў-інструменталістаў і вакалістаў. М.ш. пры прыватнаўласніцкіх т-рах упершыню пачалі рыхтаваць музыкантаў для выканання свецкай музыкі. Вядомы *Гродзенская музычна-тэатральная школа Тызенгаўза*, Нясвіжская, Слонімская, Слуцкая, Шклоўская М.ш. (гл. адпаведныя арт.). У 19 ст. працавалі Гомельская М.ш. Т.Сіпайлы (1830, пры ёй дзейнічаў духавы арк.), мінская В.Стафановіча (1840, рыхтавала музыкантаў-інструменталістаў для гар. аркестра, вучыліся хлопчыкі), *Мінская музычная школа* С.Шацкінай, магілёўская М.Пячкоўскай (з 1886); у пач. 20 ст. — гомельская С.Захарына, у якіх выкладаліся фп., скрыпка, віяланчэль, спевы, тэорыя і гісторыя музыкі, гармонія, у Гомелі — і аркестравая ігра. У 1920—21 адкрыты М.ш. 1-й і 2-й ступеней (4- і 3-гадовыя) у Віцебску, Гомелі, Мінску (пазней пераўтвораны ў школы-сямігодкі). Дзіцячыя М.ш.-сямігодкі адкрыты ў Магілёве (1919), Гомелі (1923), Мінску (1926), Бабруйску (1927), Віцебску (1928). У 1941 працавала 19 М.ш. У 1947 на базе аддзялення юных талентаў пры Бел. кансерваторыі адкрыта Сярэдняя спец. муз. школа з 11-гадовым тэрмінам навучання (з 1992 Рэсп. вучэбны комплекс гімназія-каледж пры Бел. акадэміі музыкі з 12-гадовым тэрмінам навучання), якія даюць агульную і муз. сярэднюю адукацыю, рыхтуюць да паступлення ў муз. ВНУ. На Беларусі 526 М.ш. і школ мастацтваў (навучанне музыцы, выяўл. мастацтву, харэаграфіі), Бел. рэсп. вучэбны комплекс гімназія-каледж мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка (гл. *Беларускі ліцэй мастацтва*; 2000). Некаторым М.ш. прысвоены імёны дзеячаў муз. мастацтва Беларусі, у т.л. мінскім № 1 — імя Л.П.Александроўскай і № 2 — імя М.І.Аладава, Пружанскай — імя Р.Р.Шырмы.

Літ.: Гл. да арт. *Музычная адукацыя.*

В.П.Пракапцова.

МУЗЫ́ЧЫН Сцяпан Іванавіч (25.2.1940, в. Альшаны Столінскага р-на Брэсцкай вобл. — 8.7.1990), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1989). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1963). З 1970 у Бел. НДІ эксперым. ветэрынарыі (з 1988 нам. дырэктара). Навук. працы па вет. мікрабіялогіі, вірусалогіі, эпізааталогіі, мікалогіі і імуналогіі.

Тв.: Инфекционный ринотрахеит крупного рогатого скота // Профилактика болезней жвачных на комплексах и фермах. Мн., 1978; Секреторные антитела в респираторных органах новорожденных телят // Ветеринария. 1986. № 12.

МУ́ЙСА, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Рычанка (цячэ праз возера), за 18 км на З ад г. Браслаў. Пл. 1,6 км^2, даўж. 2 км, найб. шыр. каля 1,3 км, найб. глыб. 3,9 м, даўж. берагавой лініі 6 км. Пл. вадазбору 177 км^2. Схілы катлавіны выш. да 6 м, разараныя. Берагі нізкія, забалочаныя, на Пн і Пд зліваюцца са схіламі. Пойма шыр. да 350 м, пад лугам. Дно плоскае. Вузкая прыбярэжная зона выслана пяском і ілам, глыбей — сапрапель. Зарастае.

МУКА́, 1) харчовы прадукт, які атрымліваюць размолам зерня розных культур, пераважна пшаніцы і жыта, а таксама аўса, ячменю, грэчкі, кукурузы, бабовых культур; асн. сыравіна для хлебапякарнай, макароннай і кандытарскай вытв-сцей. Якасць М. характарызуецца колерам, пахам, смакам, кіслотнасцю, вільготнасцю (14,5%), памолам, водапаглынальнай і газаўтваральнай здольнасцямі і хім. саставам (колькасць пажыўных і мінер. рэчываў, вітамінаў, ферментаў і інш.), які залежыць ад віду зерня, рэжыму яго памолу і гатунку М. Пшанічную М. вырабляюць вышэйшага, 1-га і 2-га гатункаў, крупчатку і шатраваную, жытнюю — сеяную і шатраваную. М. шатраваная і 2-га гатунку мае вітаміны (B_1,B_2, PP і E), якіх амаль няма ў М. вышэйшага і 1-га гатункаў. Гл. таксама *Мукамольна-крупяная прамысловасць.* 2) Здробненыя да парашкападобнага стану рэчывы мінер. (напр., вапнавая М.), раслінная (напр., сяннная М.) ці жывёльная (напр., касцявая М.) паходжання.

К.В.Фамічэнка.

МУ́КА (Mucke, Muka) Арнашт (10.3.1854, г. Угіст, Германія — 10.10.1932), лужыцкі мовазнавец-славіст, культ. і грамадскі дзеяч. Чл. Пецярбургскай АН, АН у Празе, Заграбе і інш. З 1870-х г. адзін з лідэраў серба-лужыцкага нац.-культ. руху, належаў да групы «младасербаў». З 1882 заснавальнік і рэдактар літ.-грамадскага час. «Lužica» («Лужы-

НЕЗАЛЕЖНЫЙ ПРАВАВЫ ІНСТЫТУТ